Брэсце, М. Пятроў — унікальным творам старaж. прыкладнога мастацтва — крыжу Ефрасінні Полацкай і абразку-энкалпіёну 12 ст. з в. Купяцічы пад Пінскам; зрабілі даклады Я. Карскі аб старaж. асаблівасцях бел. мовы і М. Авенарыус аб паходжанні і прызначэнні свінцовых пячатак-пломбаў. А. з. адыгралі вял. ролю ў вывучэнні і папулярызацыі помнікаў гісторыі і культуры Расіі.

*Літ.:* Труды девятого археологического съезда в Вильне. 1893. Т. 1—2 / Под ред. П. С. Уваровой, С. С. Слуцкого.— М., 1895—97. *Т. М. Каробушкіна.*

**АРХЕАЛО́ГІЯ АРХІТЭКТУ́РЫ** (ад грэч. archáios старажытны+... *логія*), галіна археалогіі, якая вывучае рэшткі загінуўшых або значна перароблених помнікаў архітэктуры і на аснове атрыманых звестак аднаўляе планы, рэканструюе фасады і асн. аб'ёмы помнікаў у цэлым.

Навук. археал. даследаванні помнікаў архітэктуры вядуцца ў Зах. Еўропе з 1820—40-х г., у Расіі з канца 19 — пач. 20 ст. У 1930-я г. А. а. вылучылася ў асобную галіну археалогіі. У пасляваен. гады распрацавана методыка археал. вывучэння арх. аб'ектаў, вядзецца іх сумеснае вывучэнне археолагамі, архітэктарамі-рэстаўратарамі, гісторыкамі архітэктуры і мастацтвазнаўцамі.

На Беларусі першыя археал. даследаванні архітэктуры зроблены невядомым археолагам у 1790-я г. ў Полацку, у выніку якіх раскапаны падмуркі храма-трыконха *Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра* 12 ст. З канца 19 ст. вывучаецца найб. старaж. помнік мураванай архітэктуры Беларусі — *Полацкі Сафійскі сабор:* удакладнены часы яго пабудовы і пераробак, вызначаны памеры і характар старaж. часткі і пазнейшых прыбудоў, зроблена рэканструкцыя. Рэканструяваны таксама унікальныя помнікі архітэктуры 12 ст.— *Полацкая Спаса-Ефрасіннеўская царква* і *Гродзенская Барысаглебская царква.* Археал. даследаванні выявілі 10 мураваных будынкаў 12 ст. ў Полацку, рэшткі каменных храмаў 11—12 ст. у Мінску, 12—13 ст. у Мсціславе, 12 ст. ў Тураве, палацавай і культавай пабудоў 12 ст. ў Гродне (гл. *Гродзенскія княжацкія палаты, Гродзенская Ніжняя царква*). Значных поспехаў А. а. дасягнула ў вывучэнні абарончага дойлідства Беларусі 13—18 ст. У выніку археал. раскопак выяўлены рэшткі вежаў-данжонаў, аналагічных *Камянецкай вежы,* у Брэсце, Тураве, замкавых вежаў у Навагрудку. Даследаваны многія помнікі абарончага дойлідства 14—18 ст., сярод якіх замкі ў Лідзе, Навагрудку, Гродне, Міры, в. Геранёны (Іўеўскі р-н) і інш. На тэр. *Гродзенскага старога замка* выяўлены рэшткі помніка 14—15 ст.— *Гродзенскай Верхняй царквы,* у *Навагрудскім замку* — храма пач. 14 ст. і палаца 2-й пал. 15 ст. Археал. вывучэнне *Мірскага замка* паказала, што на яго месцы ў 15 ст. знаходзілася паселішча, а *Геранёнскі замак* — адзін з першых на Беларусі, пабудаваных на ўзор стараітальянскай бастыённай сістэмы, аб чым сведчаць нізкія шматвугольныя вежы — рандэлі. Да земляных умацаванняў бастыённага тыпу аднесены *Заслаўскі замак.*

*Літ.:* Воронин Н. Н. Архитектурный памятник как исторический источник.— Советская археология, 1954, в. 19; Михайловский Е. В. Реставрация памятников архитектуры.— М., 1971; Раппопорт П. А. О методике археологических раскопок памятников древнерусского зодчества.— Краткие сообщения Института археологии, 1979, в. 135; Трусаў А. А. Археалагічнае вывучэнне помнікаў беларускай манументальнай архітэктуры XIII—XVIII ст.— Весці АН БССР. Сер. грамад. навук, 1980, № 6. *А. А. Трусаў.*

**АРХІВО́ЛЬТ** (італьян. archivolto ад лац. arcus volutus абрамляльная дуга), архітэктурна-дэкаратыўны элемент аздаблення арачнага праёма. Вылучае контур *аркі* з плоскасці сцяны. Выконваецца з клінавых камянёў, тынку, стука. Мае прафіляваную з выкарыстаннем розных па малюнку *абломаў архітэктурных* або арнаментаваную разьбой, рустам, лепкай паверхню. А., які самастойна выступае на плоскасці сцяны і не звязаны з праёмам, называецца «сляпой» аркай.

А. з'явіліся з развіццём арачных канструкцый у Ст. Рыме і Візантыі. На Беларусі пашырыліся ў архітэктуры готыкі, рэнесансу, барока, класіцызму у 2-й пал. 19—20 ст. *А. М. Кулагін.*

**АРХІ́ВЫ** (ад лац. archivum), навукова-даследчыя ўстановы (або аддзелы ва ўстановах), якія збіраюць, зберагаюць і выкарыстоўваюць дакументальныя матэрыялы, а таксама сукупнасць дакументаў, якая ўтварылася ў працэсе дзейнасці ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый, таварыстваў, прыватных асоб. Як збор крыніц А. выкарыстоўваюцца для навук. даследаванняў і практычных патрэб нар. гаспадаркі, культуры і дзярж. кіравання.

А. існуюць з глыбокай старажытнасці. Помнікі пісьменнасці (клінапісныя надпісы на гліняных таблічках, на камянях) 3—6 ст. да н. э. знойдзены ў Закаўказзі на тэр. былой рабаўладальніцкай дзяржавы Урарту. Ад антычных гарадоў Паўн. Прычарнамор'я (6—5 ст. да н. э.) захаваўся т. зв. «мармуровы архіў». Выяўлены пісьмовыя дакументы старaж. дзяржаў Сярэдняй Азіі (1 ст. да н. э.— 10 ст. н. э.). Захавалася больш за 23 тыс. старaж. армянскіх рукапісаў, значная частка іх зберагаецца ў спец. сховішчы Матандаран у Ерэване. Самы буйны А. ранняга сярэднявечча ў Зах. Еўропе — Ватыканскі архіў (узнік у 4 ст. і цяпер з'яўляецца адным з унікальных А. па гісторыі сярэдневяковай Еўропы). У Ст. Русі першыя А. ўтвараліся ў княжацкіх замках, манастырах і цэрквах. У Вял. кн. Літоўскім найбольшы архіў быў пры канцылярыі вял. князя — т. зв. Літоўская метрыка, дакументы якой за 15—16 ст. на бел. мове, а больш познія на польскай і лацінскай



**Архівольт** аркі галоўнага партала Мінскага паштамта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ